**Н.А.Булацкая,** *дацэнт*
**Н.Р.Ільіна,** *ст.выкладчык*

# ІНАВАЦЫЙНЫЯ МЕТАДЫ І ФОРМЫ САМАСТОЙНАГА ВЫВУЧЭННЯ СУСВЕТНАЙ ЛІТАРАТУРЫ СТУДЭНТАМІ-ЗАВОЧНІКАМІ УНІВЕРСІТЭТА КУЛЬТУРЫ

Складанасць навучання сусветнай літаратуры студэнтаў завочнай формы відавочная і добра вядомая. Яна ўзнікае па некалькіх прычынах: недастатковасці часу на лекцыйныя і семінарскія заняткі, з-за невялікіх прамежкаў паміж сесіямі, з-за недахопу часу ў студэнтаў, якія загружаны на асноўным месцы работы, і інш.

Сучасная педагогіка прапануе розныя формы самастойнага вывучэння таго ці іншага прадмета. Але не ўсе з іх можна выкарыстаць ў творчай навучальнай установе, тым больш на факультэце завочнага навучання.

Кафедра сусветнай літаратуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры ў мэтах паляпшэння навучальнага працэсу неаднаразова прапаноўвала: а) стварыць рэгіянальныя адукацыйныя цэнтры для завочнікаў, куды могуць выязджаць выкладчыкі універсітэта; б) наладзіць выпуск метадычных дапаможнікаў па самаадукацыі студэнтаў-завочнікаў усіх спецыялізацый; в) арганізаваць выданне студэнцкіх сшыткаў для безмашыннага праграмавання, заданняў для самакантролю ў выглядзе картак, схем, тэстаў. Да гэтых і падобных формаў работы лічым неабходным далучыць некаторыя інавацыйныя метады актывізацыі навучання завочнікаў.

У сусветнай сістэме адукацыі, часткова і ў нас, адбыўся пераход ад славесных формаў да аўдыёвізуальных. Распаўсюджванне вербальнай культуры і ўжыванне слова як асноўнага сродку навучання з'яўляецца своеасаблівасцю літаратуры, але не павінна шкодзіць выкарыстанню і сучасных



БИБЛИОТЕКА БГУКИ

тэхналогій. Нельга аб гэтым забываць. Вядома, што з дапамогай слыху і зроку чалавек атрымлівае 90% усёй інфармацыі. Шкада, што недахоп часу, інертнасць шэрага выкладчыкаў, слабая матэрыяльная база стрымліваюць працэс мадэрнізацыі, не апошняя роля ў якім належыць найноўшым камунікацыйным тэхналогіям для дыстанцыйнага навучання па літаратуры. Мяркуем, што гэта не толькі сучасны і перспектыўны, але і няпросты метад. Гаворка ідзе не аб неабходнасці, а аб складанасці яго ўвядзення ў практыку. Трэба вырашыць шэраг пытанняў, сярод якіх:

а) хто зможа ім карыстацца;

б) хто ўмее карыстацца;

в) хто мае выхад у Internet;

г) хто будзе складаць матэрыялы і загружаць камп'ютэрную базу даных;

д) хто будзе паштовым кліентам і паштовым серверам.

Магчымасць карыстацца камп'ютэрам маюць у асноўным тыя навучэнцы, якія жывуць у абласных ці раённх цэнтрах. Яны ж маюць доступ да камп'ютэрнай сеткі. У дакладзе Status Report on European Tellwork утрымліваюцца даныя аб колькасці камп'ютэраў, якія далучаны да Internet. На тысячу чалавек Беларусь мае 0,12 камп'ютэра з выхадам у "сусветную павуціну", Украіна — амаль у 4 разы больш, Расія — у 10 разоў. Не трэба даказваць, што Internet — унікальны спосаб камунікацыі і вельмі карысная крыніца інфармацыі. Internet дае магчымасць азнаямлення з навінкамі літаратуры, наведвання архіваў, чытання тэкстаў, якія не трапляюць або трапляюць у Беларусь у адным—двух экземплярах. На жаль, карыстанне сеткай Internet сёння недаступна для многіх з-за яе дарагавізны, таму ўзнікае неабходнасць рыхтаваць матэрыялы сіламі выкладчыкаў універсітэта. Аднак і на гэтым шляху маецца шэраг праблем.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

1. На лекцыі можна даць тлумачэнне нелінейнасці чалавечага мыслення і найноўшай формы вербалізацыі ментальных вобразаў — гіпертэксту, а для самастойнага вывучэння "рэкамендаваць" інфармацыю даведачна-дапаможнага характару. Тут мэтазгодна прапанаваць, на чым спыніцца, якія па форме складаць матэрыялы: тэксты лекцый, даведкі, артыкулы, кантрольныя заданні, пытанні, тэсты і інш.

2. Ці можна запланаваць (і колькі гадзін запланаваць) у гадавой нагрузцы выкладчыка час на падрыхтоўку падобных матэрыялаў?

3. Хто будзе весці камп'ютэрную перапіску, кантраляваць выкананне: выкладчык, лабарант? А можа далучыць да гэтай работы аспірантаў?

4. Адкуль браць сродкі на набыццё паперы, дыскет і інш.?

5. Што рабіць з тымі, хто не зможа падключыцца да дыстанцыйнага навучання?

Ва універсітэце ўжо з'явіліся прыклады камп'ютэрнага навучання, напрыклад навучанне па гісторыі Беларусі, якое ажыццяўляе прафесар А.І.Смолік. Відаць, неабходна вывучыць яго вопыт і разгледзець магчымасці набыцця ведаў праз камп'ютэрную адукацыю на факультэце менавіта завочнага навучання.

Удасканальваць падрыхтоўку студэнтаў-завочнікаў творчых спецыялізацый можна і пры выкарыстанні розных формаў культуралагічнага падыходу. Прыкладам можа служыць вывучэнне японскай літаратуры як часткі спецкурса "Літаратура як адлюстраванне лёсу і культуры народа". Спецкурс дапаўняе асноўны курс "Сусветная літаратура". Па спецкурсе створаны метадычны дапаможнік, ён складаецца з: 1) лекцыйнага курса; 2) ілюстрацыйнага літаратурнага (празаічнага, драматургічнага, паэтычнага) матэрыялу; 3) літаратурнага слоўніка; 4) кантрольных пытанняў; 5) творчых



БИБЛИОТЕКА БГУКИ

заданняў; 6) спіса мастацкай, тлумачальнай і дапаможнай літаратуры.

Гэты дапаможнік актывізуе самастойную работу студэнтаў, яны маюць магчымасць падрыхтавацца да экзаменаў па месцы жыхарства.

Падрабязней спынімся на творчых заданнях. У залежнасці ад спецыялізацыі (харэаграфія, спевы, прыкладное мастацтва і інш.) студэнты ствараюць непаўторныя работы, напрыклад нацыянальныя японскія лялькі з дрэва ці тканіны; фігуркі нэцке з беларускай гліны; робяць роспіс па шкле, дрэве; ажыццяўляюць пастаноўку танца; складаюць вершы. Гэтыя работы могуць быць і ілюстрацыяй да прачытанага мастацкага твора, а могуць быць тым водгукам на іншую, іншаземную культуру, якую не так проста асэнсаваць. Студэнты спасцігаюць іншасказальнасць, метафарычнасць вобразаў, што дазваляе ўбачыць у адзіным агульнае, праз дэталь спасцігнуць цэлае. Гэтыя работы дапамагаюць, напрыклад, зразумець, якім чынам кананічнае мастацтва ніхонга і хайку абапіралася на шырокі кантэкст культуры і ўзаемадзейнічала з ім, выклікала ў гледача і чытача шматлікія сэнсавыя асацыяцыі, за кошт якіх паглыбляўся і пашыраўся змест твора.

Дзякуючы самастойнай рабоце па вывучэнні літаратурных і мастацкіх твораў студэнты могуць лепш зразумець, што звязвае не толькі розныя культуры, але і што на працягу стагоддзяў звязвае народы свету і дае магчымасць узаемнага духоўнага ўзбагачэння.

Лепшыя работы студэнтаў экспанаваліся на выставах у Амбасадзе Японіі ў Беларусі, Доме дружбы і культурных сувязей з замежнымі краінамі.

У сваю чаргу студэнты ФЗН выкарыстоўваюць веды па курсе ў працы (напрыклад, у розных мастацкіх гуртках) з дзецьмі і дарослымі.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Як бачна, існуюць розныя метады і формы актывізацыі самастойнага вывучэння сусветнай літаратуры. Галоўнае ў тым, каб была зацікаўленасць у выніках гэтай работы як у студэнтаў, так і ў выкладчыкаў.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ